

# Гродзенскі Універсітэт

ГАЗЕТА ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

Выдаецца з 1986 года • *№ 4 (244) 3 мая 1997 года, субота*

Распаўсюджваецца бясплатна • Выходзіць адзін раз у месяц


# 9 МАЯ – ДЕНЬ ПОБЕДЫ



## ЦИТАТА НОМЕРА:

**"Мужество считает ничтожными удары судьбы".**

**Демокрит.**

## ВЕСНОЙ 1945-го...

**И. ПРОКОПЬЕВ,**
**бывший командир пулеметного отделения 9-й Гвардейской Армии, доцент кафедры педагогики**

К началу войны я был еще подростком и только в 1943 году семнадцатилетним был призван в Красную Армию. Был курсантом военного училища, а преимущественно служил в воздушно-десантных войсках. Участвовал в боях на Карельском фронте, а затем - на 3-м Украинском, был в походах по Румынии, Югославии, Венгрии, Австрии и Чехословакии. Трудно выделить из тех дней какой-то один, - все они были своеобразны, насыщены разными событиями и эпизодами. И все же мне хочется рассказать о форсировании реки Раба в Венгрии.

Отразив удар врага у озер Балатон и Веленце, наши войска в марте 1945 г. сами перешли в наступление в общем направлении от г. Секешфехервар на столицу Австрии г. Вену. Прорвав оборону противника, мы без передышки преследовали его. Чтобы задержать наше стремительное продвижение, враг использовал различные естественные рубежи, выгодные для обороны. На нашем пути одним таким рубежом оказалась река Раба - правый приток Дуная. Противник нас непрерывно держал под минометным и артиллерийским обстрелом. Наш батальон получил задачу форсировать реку рано утром следующего дня. Повидимому, саперы и понтонеры значительно отстали от передовых отрядов, поэтому было приказано форсировать реку на подручных средствах, разведать брод. В полукилометре в нашем тылу была деревня, и наши солдаты там взяли то, что могло помочь при переправе: бочки, кадушки, бревна, доски. Для нашего станкового пулемета мы выбрали ворота, а для коробок с патронами - деревянное корыто. Всю ночь противник ракетами освещал реку. И все же на нашем участке еще до рассвета четверо разведчиков благополучно перебрались на вражеский берег и захватили небольшой участок, куда мы могли переправиться со своим пулеметом. Товарищи помогли нам спустить наш плотик на воду, загрузили и корыто патронными коробками. Мы с Зайцевым под вражеским обстрелом поплыли на западный берег, а вода от разрывов мин и снарядов столбом вздымалась то дальше, то ближе от нас. Прямого попадания не было, и мы благополучно переплыли реку. Выбравшись на берег, встретились с разведчиком Сахаровым. Вскоре установили свой пулемет на огневую позицию, помогли разведчикам влево и вправо расширить участок для форсирования реки, не подпустили противника к этому участку. Так, переправившись через Рабу в числе первых, мы с Зайцевым и разведчиками помогли всему нашему батальону без потерь форсировать реку. Впереди был небольшой хутор, откуда противник вел минометный обстрел, слышался и треск автоматных очередей. Взводу бойцов приказано взять этот хутор, а мы своим огнем поддерживали их наступление. Хутор вскоре был в наших руках.

За успешное выполнение боевого задания при форсировании реки я потом был награжден медалью "За отвагу". А до полной победы оставалось немногим больше одного месяца. День Победы я встретил в госпитале в г. Бад-Веслау, недалеко от Вены.

**На снимке: И.И. ПРОКОПЬЕВ.**
**Фото из архива, 1978 год.**

**Аляксей СЛАБУХА,**
**ветэран Вялікай Айчыннай вайны**

## УСПАМІНЫ

Не праходзяць успаміны,
Іх спыніць я не магу.
Свісты куль і грохат мінаў
Быццам зараз на слыху.
Паўстаюць вайны малюнкі
На вогненным палатне.
У мяне свае рахункі
Той бязлітаснай вайне.
З хатаў сталі папялішчы,
Зчырванела ўся зямля.
Колькі жыццяў вораг знішчыў,
Падлічыць не ў сілах я.
Ды не змог фашыст закляты
Нас навекі пакарыць.
Перамогі прыйшло свята,
Назаўсёды яму быць!
Сказаць слова ветэрана
Пакаленням я хачу:
Беражыце мір старанна,
Гэта кожны каб пачуў.

## ВІНШАВАЛЬНАЯ ПАШТОЎКА

ВІНШУЕМ НАШЫХ ЮБІЛЯРАЎ І НАГАДВАЕМ, КАЛІ І КАГО МОЖНА ПАВІНШАВАЦЬ З НАГОДЫ ЮБІЛЕЮ.

☼ 1 мая — Сцяпана Мікалаевіча *ЯНКОЎСКАГА* - старшага выкладчыка кафедры выяўленчага мастацтва.

☼ 1 мая — Марыю Уладзіміраўну *ТОЛКАЧ*- прыбіральшчыцу.

☼ 9 мая — Уладзіміра Мікалаевіча *КАМАРА*- дацэнта кафедры інжынерна-тэхнічнай падрыхтоўкі.

☼ 18 мая — Соф'ю Іванаўну *СЯЎРУК* - загадчыцу кабінета псіхалогіі.

☼ 19 мая — Людмілу Піліпаўну *БАЛАБУЕВУ* - акампаніятара кафедры фізвыхавання.

☼ 20 мая — Кацярыну Андрэеўну *САДОЎСКУЮ* - метадыста вышэйшай катэгорыі.

☼ 21 мая — Галіну Іванаўну *ІНДУШКА* - дацэнта кафедры анатоміі і фізіялогіі чалавека.

☼ 24 мая — Барыса Фёдаравіча *ГРЫЦЭНКА* - начальніка аддзела кадраў.

☼ 26 мая — Валянціну Сяргееўну *ШЧЭРБУ* - дзяжурную.

☼ 28 мая — Зою Анатольеўну *НАСКО* - загадчыцу аспірантуры.



**Афіцыйна**

# НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

На чарговым пасяджэнні Савета універсітэта былі разгледжаны наступныя пытанні: выбранне па конкурсу і прысваенне вучоных званняў, заслухана інфармацыя прарэктара па навукова-даследчай рабоце доктара фізіка-матэматычных навук С.А. Маскевіча "Аб удасканаленні развіцця інфарма-цыйнай базы універсітэта".

Была таксама заслухана інфармацыя начальніка выдавецкага аддзела Я.С. Бартлевіч "Аб удзеле выдавецкага аддзела ў рабоце па паляпшэнні эфектыўнасці навучальнага працэсу і аб перспектывах развіцця выдавецкай справы ва універсітэце".

Па гэтых пытаннях былі прыняты адпаведныя пастановы.

У раздзеле "рознае" члены Савета універсітэта разгледзелі надзённыя пытанні.

# АБМЕРКАВАНА РЭКТАРАТАМ

На першым красавіцкім пасяджэнні рэктарата была абмеркавана дзейнасць універсітэта па арганізацыі ліцэя.

З інфармацыяй па выніках апошняга педсавета выступіла дацэнт кафедры педагогікі Н.М. Петрыкава. Ліцэй мае восем профіляў. Вучацца ў ім 450 ліцэістаў, у тым ліку на "добра" і "выдатна" - 200 . Праводзілася анкетаванне ліцэістаў з тым, каб высветліць адзнаку ўзроўню выкладання.

У ліцэі развіваецца даследчая дзейнасць навучэнцаў, ёсць неблагія вынікі. Напрыклад, у Мінску на канферэнцыі "эканамічнае праектаванне" пабывалі 12 вучняў з Гродна. 4 ліцэісты занялі 1-2 месцы.

Наогул жа ў ліцэі лепш фармуюцца даследчыя навыкі, ярка адлюстроўваецца ідэя гуманізацыі адукацыі.

Затым члены рэктарата і запрошаныя педагогі з ліцэя абмяняліся думкамі, выказалі свае прапановы па ўдасканаленні работы звяна настаўнік - ліцэй - універсітэт.

Па другім пытанні - завяршэнні работы па падрыхтоўцы да атэстацыі універсітэта - выступіла начальнік навучальна-метадычнага аддзела, дацэнт Т.А. Бадзюкова. Яна падвяла вынікі работы, спынілася на тых недахопах, якія з'яўляюцца агульнымі для факультэтаў і кафедр, і выказала прапановы, як наладзіць справу: мадэрнізаваць формы справаздачнасці, правесці яшчэ адзін семінар для загадчыкаў кафедр.

Выступіў таксама па гэтым пытанні начальнік навучальнага аддзела Ю.Ю. Гняздоўскі.

* * *

На пасяджэнні рэктарата 14 красавіка разгледжана пытанне аб рабоце бібліятэкі па камплектацыі фонда навучальна-метадычнай літаратуры. З інфармацыяй па гэтым пытанні выступіў загадчык бібліятэкі В.С. Станкевіч.

Сёння фонд бібліятэкі налічвае звыш 560 тысяч экземпляраў кніг. Гэта - больш чым фонд абласной бібліятэкі. Фонд пастаянна папаўняецца. Толькі ў першым квартале бягучага года атрымалі навучальнай і навучальна-метадычнай літаратуры на 124 мільёны рублёў.

Малавата падручнікаў па такіх дысцыплінах, як біялогія і экалогія, фізічная культура. Лепш папаўняецца фонд па эканоміцы, праву, псіхалогіі, вылічальнай тэхніцы. Тут шмат выдаецца навінак, і бібліятэка імкнецца атрымаць іх.

Дапамагае ў папаўненні кніжнага фонду супрацоўніцтва з Расіяй. Бібліятэка атрымлівае тую ж навучальную і навучальна-метадычную літаратуру, што і маскоўскія ці санкт-пецярбургскія вышэйшыя навучальныя ўстановы. Дапамагае таксама фонд Сораса, праз які літаратура размяркоўваецца бясплатна. Папаўняецца бібліятэчны фонд і за кошт навучальна-метадычнай літаратуры, якая выдаецца непасрэдна ва універсітэце.

Навучальная літаратура, - сказаў В.С. Станкевіч, - на жаль, вельмі хутка "старэе". Таму і даводзіцца сачыць за навінкамі кніжнага рынку, пастаянна папаўняць фонд.

Па гэтым пытанні рэктарат прыняў пастанову. Савету бібліятэкі прапанавана распрацаваць праграму развіцця бібліятэкі, удасканалення абслугоўвання студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў.

# 9 МАЯ – ДЕНЬ ПОБЕДЫ

## ПОМНЮ ТЕ БУДНИ

**А. КРУШЕЛЬНИЦКИЙ,**
**старший преподаватель кафедры алгебры и геометрии и методики преподавания математики, участник ВОВ**



Я отношусь к поколению солдат последнего военного призыва. Меня и моих сверстников - учеников 7-го класса Берестовицкой средней школы - призвали в армию в октябре 1944 года. Мне тогда еще не исполнилось и 17 лет.

А до этого - июнь 1941 года. Начало Великой Отечественной войны, с первых дней которой начались массированные бомбардировки маленького городка с 6-тысячным населением, в котором мы в то время жили. Непрекращающиеся бомбардировки выгнали жителей городка на расположенные вблизи поля и пастбища. Но и это не спасло мирных граждан. Немецкие разведывательные самолеты "рамы" по нескольку раз в день пролетали на небольшой высоте над жителями, и немецкое командование было прекрасно осведомлено о том, что в полях и на пастбище расположились мирные граждане. И, несмотря на это, немцы открыли артиллерийский огонь по мирным гражданам. Было много убитых и раненых. Так пришлось мне в первые же дни узнать ужасы войны.

Потом была оккупация. Немцы и местные полицаи зверствовали. Школ не было. Приходилось скрываться, чтобы не быть угнанным на работу в Германию. По мере сил помогал подпольщикам в сборе оружия и боеприпасов. Наконец пришло долгожданное освобождение. Был июль 1944 года. Обстановка требовала обеспечивать тылы, и я вместе со сверстниками был молибизован на рытье траншей и окопов. Затем прошел курсы минеров и принимал участие в разминировании местности.

Итак, я в армии. Идут армейские будни, наполненные напряженной подготовкой к фронту. В феврале 1945 года наше подразделение было подготовлено к маршу. Три дня мы жили в вагонах-теплушках, ожидая отправления на фронт. Затем пришел приказ, и нас распределили кого куда: некоторых отправили в Иран, других - в освобожденные страны Европы, третьих оставили в Союзе. Потом началась долгая служба, которая длилась 8 лет. Демобилизован был в декабре 1952 года.

Награжден медалью "За победу над Германией в Великой Отечественной войне 1941-1945 годов" и всеми юбилейными медалями.

**На снимке: А.А. КРУШЕЛЬНИЦКИЙ (слева) с боевым товарищем.**

**Фото из архива.**

# ДЗЕНЬ ІНФАРМАВАННЯ

10 красавіка, у адзіны дзень інфармавання насельніцтва, з прадстаўнікамі калектыву універсітэта сустрэліся намеснік старшыні гарвыканкама Я.М. Жабрун, загадчыкі аддзелаў гарвыканкама: інфармацыі - Л.В. Цяжкая, культуры - І.І. Кліменка, адукацыі - Л.П. Папянюк.

Я.М. Жабрун расказаў прысутным аб сучасным стане горада, аб праблемах, якія трэба вырашаць, аб перспектывах.

Напрыклад, у нашым горадзе налічваецца 411 вуліц. У штодзённых турботах мы ніколі аб гэтым не задумваліся, дарэчы, як і над тым, якія назвы яны носяць. У Гродне шырока прадстаўлена прамысловасць. Але, на жаль, - сказаў Я.М. Жабрун, - працуе яна не на поўную моц. Не так, як трэба, працуе і гарадскі аўтатранспарт. Калі б не тралейбусы, гараджане маглі б аказацца ў цяжкім становішчы. Добра ў горадзе развіваецца гандаль. Слаба - прыватызацыя, асабліва - жылога фонду. Толькі 58 працэнтаў кватэр набылі ўласнікаў.

Яшчэ сказаў дакладчык, падпісаны аб інтэграцыі з Расіяй дагавор павінен стаць галоўным дакументам у нашым далейшым жыцці і дзейнасці.

Пасля прадстаўнікі гарадскіх уладаў адказалі на пытанні аўдыторыі.

# ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ



У красавіку адбылася прафсаюзная канферэнцыя прафсаюза выкладчыкаў і супрацоўнікаў, на якой былі падведзены вынікі выканання калектыўнага дагавору на 1996 год, а таксама быў прыняты калектыўны дагавор на 1997 год.

З інфармацыяй выступіў старшыня прафкама У.А. Хілюта. Як жа працаваў прафсаюзны камітэт у справе сацыяльнай абароны супрацоўнікаў?

- Становіцца ўсё складаней ажыццяўляць сацыяльную абарону, - сказаў дакладчык. - Фінансавае становішча цяжкае, на дапамогу ўрада разлічваць не прыходзіцца. Дзяржаўная падтрымка прафсаюзаў слабая, і ў гэтых умовах многія пытанні амаль немагчыма вырашыць.

І ўсё ж такі прафкам, дзякуючы фінансавай падтрымцы адміністрацыі, сумеў самастойна зрабіць усё пасільнае, каб стварыць добрыя ўмовы працы і сацыяльнай абароны людзей, выканаць асноўныя пункты калектыўнага дагавору.

Першае, на чым больш падрабязна спыніўся У.А. Хілюта, гэта тое, што ў калектыўны дагавор была закладзена нядрэнная прававая база, і гэта дапамагло рэалізаваць асноўныя яго напрамкі. Напрыклад, палажэнне аб прэміраванні і дэпрэміраванні. Афіцыйна ў прафкам паступіла ўсяго адна скарга.

Членам прафкама прафесарам Сільчанкам распрацавана палажэнне аб размеркаванні прыбытку, атрыманага ад камерцыйнай і гаспадарчаразліковай дзейнасці. Гэта палажэнне дазволіць стварыць праграму сацыяльнай абароны членаў прафсаюза.

Вострай, як і заўсёды, з'яўляецца праблема жылля. У спісе на яго атрыманне - больш як 80 выкладчыкаў, у тым ліку 2 прафесары, 37 кандыдатаў навук і каля 40 супрацоўнікаў. Каля 70 выкладчыкаў і супрацоўнікаў жывуць у студэнцкіх інтэрнатах. У той час каля 400 студэнтаў жывуць на прыватных кватэрах. Больш за 30 супрацоўнікаў стаяць у чарзе на атрыманне жылля ў інтэрнатах універсітэта. Вось чаму праблему гэту прафкам лічыць першаступеннай. На што спадзявацца? У нейкай ступені дапаможа зняць вастрыню праблемы дом на вуліцы Горкага, які сёлета, магчыма, будзе нарэшце заселены.

Нядрэнна працаваў прафкам у справе аздараўлення супрацоўнікаў і іх дзяцей. У мінулым годзе на санаторна-курортнае лячэнне было выдзелена 115 мільёнаў рублёў. Гэта дазволіла дадаткова набыць 29 пуцёвак для дарослых і 59 - для дзяцей. Усяго ж у мінулым годзе 42 супрацоўнікі паправілі сваё здароўе. А ў дзіцячых аздараўленчых цэнтрах пабывала 82 дзіцяці. Акрамя гэтага, праводзіліся спартакіяды і іншыя аздараўленчыя мерапрыемствы.

У полі зроку адміністрацыі і прафкама былі і пытанні зарплаты. Сярэдняя зарплата за люты 1997 года па бюджэту склала 1.343.000 рублёў, а з улікам пазабюджэтных даплат - 1.760.000. Сюды ўваходзіла прэзідэнцкая матэрыяльная дапамога - 860,4 млн. руб., пазабюджэтная - 156,7, бюджэтная прэмія - 941, 2 млн., прэмія пазабюджэтная - 845 мільёнаў рублёў.

У рамках комплекснай праграмы "Клопат" адміністрацыя і прафкам аказвалі дапамогу ў забеспячэнні гароднінай непрацуючых пенсіянераў, дапамагалі матэрыяльна ветэранам і ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, праводзілі ўрачыстыя ўшанаванні юбіляраў.

Адміністрацыя і прафкам многае зрабілі і робяць для стварэння ў калектыве добрага маральна-псіхалагічнага клімату, для таго, каб кожны набыў упэўненасць у сваіх сілах. І гэта ўдаецца.

Па матэрыялах канферэнцыі была прынята пастанова. Створана таксама камісія па працоўных спрэчках. У склад яе ўвайшлі з боку прафкама С.А. Мінюк, М.У. Сільчанка, М.І. Ажогін. З боку адміністрацыі - А.Ф. Тарыма, Г.С. Сакольская, Ю.Ю. Гняздоўскі.

# КАЛЕКТЫЎНЫ ДАГАВОР
## ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ НА 1997г.

### РАЗДЗЕЛ 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Калектыўны дагавор з'яўляецца нарматыўным актам, які рэгулюе працоўныя і сацыяльна-эканамічныя адносіны паміж адміністрацыяй і супрацоўнікамі універсітэта.

Калектыўны дагавор заключаецца паміж адміністрацыяй Гродзенскага універсітэта ў асобе рэктара і працоўным калектывам, ад імя якога выступае прафсаюзны камітэт, прымаецца на канферэнцыі працоўнага калектыву, падпісваецца рэктарам і старшынёй прафкама і ўступае ў дзеянне з моманту яго падпісання і дзейнічае да заключэння новага калектыўнага дагавору (але не больш чым на тры гады).

1.2. Калектыўны дагавор заключаецца на падставе дзейнічаючага заканадаўства РБ, "Пагаднення паміж Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь і Рэспубліканскім камітэтам прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі" на 1997-1998 г. ад 16.12.96 г., Статута універсітэта і наладжвае ўзаемныя абавязкі адміністрацыі і прафсаюзнага камітэта па рашэнні працоўных і сацыяльна-эканамічных задач.

1.3. Адміністрацыя універсітэта прызнае прафкам адзіным прадстаўніком працоўнага калектыву пры заключэнні калектыўнага дагавору, а таксама пры рашэнні ўсіх пытанняў, звязаных з яго выкананнем.

1.4. Адміністрацыя сумесна з прафсаюзным камітэтам абавязана ажыццяўляць кантроль за ходам выканання калектыўнага дагавору, даваць справаздачу перад працоўным калектывам аб яго выкананні не менш 2 разоў у год.

1.5. Прафсаюзны камітэт можа заслухоўваць прадстаўнікоў адміністрацыі і кіраўнікоў падраздзяленняў па выкананні абавязкаў калектыўнага дагавору, патрабаваць прыпынення выканання рашэнняў, калі яны прыняты ў парушэнне яго палажэнняў ці дзейнічаючага заканадаўства.

1.6. Адміністрацыя павінна ў тэрмін да 10 дзён разглядаць прадстаўленні прафсаюзнага камітэта аб існуючых недахопах у выкананні калектыўнага дагавору і даваць матываваны адказ па іх выпраўленні ў пісьмовай форме.

1.7. Адміністрацыі і прафсаюзнаму камітэту даецца права па ўзаемнай згодзе пераносіць тэрміны выканання мерапрыемстваў, вызначаных у асобных раздзелах калектыўнага дагавору.

1.8. Прафсаюзны камітэт прымае ўдзел у распрацоўцы праекта Статута універсітэта ці зменаў, дапаўненняў, якія ўносяцца ў дзейнічаючы Статут і Правілы ўнутранага распарадку.

1.9. Асноўнымі прынцыпамі заключэння калектыўнага дагавору з'яўляюцца:

сацыяльнае партнёрства;

раўнапраўе бакоў;

улік рэальных магчымасцяў матэрыяльнага, вытворчага і фінансавага забеспячэння абавязкаў, якія прымаюцца.

1.10. Адміністрацыя і прафсаюзны камітэт даводзяць да ўсіх работнікаў тэкст калектыўнага дагавору ў месячны тэрмін з дня падпісання і забяспечваюць галоснасць яго выканання.

1.11. Спрэчкі, якія ўзнікаюць паміж бакамі, разглядаюцца парытэтным Саветам, у склад якога ўваходзяць па пяць прадстаўнікоў ад прафкама і адміністрацыі. Савет ствараецца пры прыняцці калектыўнага дагавору.

1.12. Палажэнні калектыўнага дагавору распаўсюджваюцца толькі на членаў прафсаюзнай арганізацыі.

1.13. Змены і дапаўненні ў калектыўны дагавор уносяцца са згоды адміністрацыі і прафкама па пісьмовай прапанове аднаго з іх у 2-х—тыднёвы тэрмін са дня паступлення прапановы ў парадку, устаноўленым бакамі.

1.14. Калектыўны дагавор не перашкаджае ўстанаўленню дадатковых у параўнанні з ім і дзеючым заканадаўствам ільгот і гарантый, уведзеных за кошт сродкаў працоўнага калектыву.

1.15. Асобы, вінаватыя ў невыкананні (парушэнні) умоваў калектыўнага дагавору, могуць быць пазбаўлены прэміі часткова або цалкам, а таксама на іх можа быць накладзена дысцыплінарнае спагнанне.

Прадстаўленне аб накладанні дысцыплінарных спагнанняў на прадстаўнікоў бакоў (рэктара і старшыні прафкама) накіроўваюцца ў вышэйшыя органы ў парадку падпарадкавання, якія павінны інфармаваць калектывы аб прынятых мерах у месячны тэрмін.

1.16. Бакі абавязаны прымаць неабходныя меры для вырашэння канфліктных сітуацый шляхам перамоваў на аснове ўзаемнай павагі. У выпадку ўзнікнення калектыўных працоўных спрэчак прадстаўленне патрабаванняў ажыццяўляецца па парадку, прадугледжаным існуючым заканадаўствам.

### РАЗДЗЕЛ 2. АРГАНІЗАЦЫЯ, НАРМАВАННЕ І АПЛАТА ПРАЦЫ

**Адміністрацыя павінна:**

2.1. Распрацаваць праграму эфектыўнага навуковага і эканамічнага развіцця матэрыяльнай базы універсітэта ва ўмовах рыначнай эканомікі.



2.2. Захаваць у адпаведнасці з дзейнічаючым палажэннем для прафесарска-выкладчыцкага саставу конкурсны парадак замяшчэння пасад. З асобамі пенсіённага ўзросту дазволіць адміністрацыі заключаць кантракты толькі пасля заканчэння тэрміну выбрання на пасаду.

2.3. Стварыць умовы для павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў і супрацоўнікаў - (не менш аднаго раза на працягу 5 гадоў) згодна з планам падраздзяленняў і перспектыўным планам развіцця універсітэта.

2.4. Не дапускаць неабгрунтаванага, незаконнага скарачэння работнікаў і працоўных месцаў.

2.5. Размяркоўваць чысты прыбытак, атрыманы ад камерцыйнай і гаспадарчай дзейнасці з улікам сацыяльна-эканамічных інтарэсаў працоўнага калектыву. Распрацаваць сумесна з прафсаюзным камітэтам Палажэнне аб памеры долі гэтага прыбытку і парадку яго размеркавання.

2.6. Своечасова здзяйсняць кампенсацыі і індэксацыі па заработнай плаце з улікам росту спажывецкіх цэнаў у адпаведнасці з дзейнічаючым заканадаўствам.

2.7. Устанаўліваць даплаты да тарыфных ставак і службовых акладаў па пераліку працы са шкоднымі ўмовамі працы, а таксама за працу ў начную змену, у выхадныя і святочныя дні, адпаведна дзейнічаючаму заканадаўству.

2.8. Пры своечасовым фінансаванні аплату працы праводзіць у адпаведнасці з зацверджанымі стаўкамі і акладамі з 5 па 8 (разлік) і з 21 па 24 (аванс) даты кожнага месяца, а ў выпадку супадзення названых дат з выхаднымі ці святочнымі днямі - адпаведна ў папярэднія або наступныя дні.

2.9. Для прафесарска-выкладчыцкага саставу ўсталёўваецца шасцігадзінны працоўны дзень, у межах якога яны павінны выконваць усе віды вучэбна-метадычнай і навукова-даследчай работы. Аўдыторныя заняткі выкладчыкаў звыш шасці гадзін у дзень дазваляюцца толькі з іх згоды.

2.10. Для рабочых і служачых, якія не прымаюць удзел непасрэдна ў вучэбным працэсе, устанаўліваецца 5-дзённы працоўны тыдзень. Спіс рабочых і служачых зацвярджаецца загадам рэктара універсітэта. Час пачатку і заканчэння працы ўстанаўліваецца кіраўнікамі структурных падраздзяленняў, зыходзячы з 8-гадзіннага працоўнага дня. У перадсвяточныя дні працоўны дзень заканчваецца на адну гадзіну раней.

2.11. Для супрацоўнікаў з нармаваным працоўным днём адміністрацыя павінна арганізаваць улік прыходу на працу і адыходу з працы, распрацаваць функцыянальныя абавязкі вучэбна-дапаможнаму персаналу.

2.12. Выплату адпускных грошай здзяйсняць строга ў адпаведнасці з дзейнічаючым заканадаўствам.

2.13. Умовы працы па індывідуальных кантрактах не павінны быць горшымі за ўмовы працы, якія ўстаноўлены калектыўным дагаворам.

2.14. Сістэматычна здзяйсняць кантроль за правільнасцю разлікаў па зарплаце, нармаванню і аплаце працы супрацоўнікам універсітэта. Выдачу разліковых лістоў праводзіць па ўсіх відах заработнай працы.

2.15. Прэміраванне супрацоўнікаў і ўстанаўленне ім надбавак за высокія творчыя дасягненні ў працы, выкананне тэрміновых работ ажыццяўляецца на аснове Палажэння, якое зацверджана Саветам універсітэта і прафкама, і прыкладаецца да дагавору.

2.16. Размеркаванне вучэбнай нагрузкі праводзіць адміністрацыя па ўзгадненню з прафкамам. Папярэдняе размеркаванне на будучы год ажыццяўляецца да пачатку летніх адпачынкаў.

2.17. Даводзіць праз газету "Гродзенскі універсітэт" і інфармацыйны стэнд бухгалтэрыі да ведама супрацоўнікаў універсітэта новыя стаўкі заработнай платы, змены ва ўмовах аплаты працы.

У выпадку змянення зарплаты ў 2-х тыднёвы тэрмін з часу паступлення адпаведных дакументаў з Міністэрства адукацыі рабіць пераразлік і згодна з ім выплочваць заработную плату.

2.18. **Бакі прыйшлі да згоды:**

2.18.1. Адстойваць існуючую рэдакцыю абзаца 7 арт.34 Закона "Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь" наконт аплаты заработнай платы прафесарска-выкладчыцкага саставу.

2.18.2. Даплаты спецыялістам і служачым могуць устанаўлівацца за сумяшчэнне абавязкаў часова адсутнічаючага супрацоўніка (хвароба звыш 2-х тыдняў, дэкрэтны водпуск па догляду за дзіцём да 3-х гадоў, працяглая камандзіроўка) і па рабочых пасадах з аплатай да 100%.

2.18.3. У сувязі з пастаянным павелічэннем аб'ёму працы бухгалтэрыі і ПЭА прэміраванне работнікаў дадзеных службаў, непасрэдна занятых з пастаяннымі пераразлікамі, налічэннямі і выдачай заработнай платы, а таксама ўстанаўленне надбавак да іх акладаў ажыццяўляецца ў строгай адпаведнасці з пісьмом Міністэрства адукацыі і навукі РБ ад 22.07.1994 г. за № 19/86.

2.18.4. Камісіі па атэстацыі працоўных месцаў да 1 верасня 1997 г. распрацаваць мерапрыемствы па паляпшэнні ўмоваў працы супрацоўнікаў універсітэта, вызначыць пералік працоўных месцаў, прафесіяў і пасадаў работнікаў, якім устанаўліваюцца даплаты за працу з неспрыяльнымі ўмовамі працы і, узгадніўшы з прафкамам, уключыць у калектыўны дагавор у выглядзе дадатку.

## РАЗДЗЕЛ 3. АХОВА ПРАЦЫ, УМОВЫ ПРАЦЫ І ТЭХНІКА БЯСПЕКІ

**Адміністрацыя павінна:**

3.1. Своечасова праводзіць усе віды інструктажу па АП, ТБ і супрацьпажарнай прафілактыцы.

3.2. Рэгулярна праводзіць навучанне і праверку ведаў супрацоўнікаў, якія заняты на работах з павышанай небяспекай.

3.3. Правесці максімальнае скарачэнне працоўных месцаў, якія не адпавядаюць патрабаванням і нормам аховы працы ў вытворчасці са шкоднымі ўмовамі працы.

3.4. Кіравацца Пералікам работаў і прафесій, па якіх супрацоўнікі маюць права на атрыманне дадатковага адпачынку ў сувязі са шкоднымі ўмовамі працы, а таксама надбаўкі да заработнай платы і іншыя льготы. Распрацаваць да 1 чэрвеня 1997 г. і ўключыць у калектыўны дагавор у якасці дадатку Пералік прафесіяў і пасадаў, якія маюць права на дадатковы адпачынак і скарочаны працоўны дзень у сувязі з неспрыяльнымі ўмовамі працы і на дадатковы адпачынак за ненармаваны працоўны дзень.

3.5. Своечасова забяспечыць супрацоўнікаў універсітэта, працуючых у шкодным асяроддзі, спецадзеннем, спецабуткам і іншымі сродкамі ў адпаведнасці з існуючымі Нормамі і Правіламі. Пералік прафесіяў і пасадаў, якія маюць права на атрыманне сродкаў індывідуальнай абароны, уключыць у калектыўны дагавор у якасці дадатку. Тэрмін выканання — да 1 чэрвеня 1997 г.

3.6. Своечасова праводзіць абмеркаванне няшчасных здарэнняў, траўматызму, выдаваць загады аб пакаранні віноўных асобаў.

3.7. Скараціць да мінімуму колькасць вячэрніх заняткаў для выкладчыкаў-жанчын, якія маюць дзяцей школьнага ўзросту, і не прыцягваць да вячэрніх заняткаў жанчын, якія маюць дзяцей дашкольнага ўзросту, без іх згоды.

3.8. Забяспечыць выкананне мерапрыемстваў па пагадненню па ахове працы і ТБ (дадатак № 1).

3.9. Арганізаваць навучанне і правесці ў другім паўгоддзі 1997 г. атэстацыю кіраўнікоў, інжынерна-тэхнічных работнікаў і спецыялістаў па пытаннях аховы працы і тэхнікі бяспекі.

## РАЗДЗЕЛ 4. ПРАЦОЎНАЯ ДЫСЦЫПЛІНА, ПЕРАВОДЫ, ЗВАЛЬНЕННІ І ПРАВАВЫЯ ГАРАНТЫІ

**Адміністрацыя павінна:**

4.1. Выкарыстоўваць меры заахвочвання за поспехі ў навукова-педагагічнай і вытворчай дзейнасці з улікам асабістага ўклада ў вучэбную і навуковую дзейнасць.

4.2. Прымяняць да парушальнікаў працоўнай і вучэбнай дысцыпліны санкцыі дзеючага працоўнага заканадаўства РБ.

4.3. За страты, прычыненыя наймальніку пры выкананні працоўных абавязкаў, работнікі універсітэта, па віне якіх прычынены страты, нясуць абмежаваную матэрыяльную адказнасць (не больш за сярэднямесячны заработак) за выключэннем выпадкаў, якія ўказваюцца ў заканадаўстве. Устанавіць для работнікаў універсітэта рэжым працы згодна з Правіламі ўнутранага распарадку і заканадаўствам аб працы Рэспублікі Беларусь.

4.4. Адміністрацыя абавязана паведаміць работніка аб увядзенні новых ці змяненні дзейсных умоваў аплаты працы не пазней, чым за адзін месяц. Распрацаваць Пералік работ і пасад работнікаў універсітэта, з якімі павінны заключацца дагаворы аб поўнай матэрыяльнай адказнасці.

4.5. Прадстаўляць загады аб устанаўленні парадку аплаты і ўмоў працы па ўзгадненню з прафкамам не пазней, чым за месяц да выканання.

4.6. Даваць штогадовыя водпускі супрацоўнікам універсітэта па графіку, зацверджанаму кіраўніком структурнага падраздзялення і ўзгодненаму з прафсаюзным камітэтам. У асобных выпадках па-за графікам па рашэнню адміністрацыі і ўзгадненню з прафкамам без шкоды для вучэбнай і навукова-вытворчай дзейнасці.

4.7. Скасаваць працоўны дагавор, заключаны на нявызначаны тэрмін, калі работнік папярэдзіў адміністрацыю пісьмовай заявай за адзін месяц.

4.8. Аператыўна разглядаць скаргі супрацоўнікаў па канфліктных сітуацыях у падраздзяленнях універсітэта і прымаць па іх рашэнні ва ўстаноўленыя законам тэрміны.

4.9. Супрацоўнікам, якія прапрацавалі ва універсітэце не менш 10 гадоў, адміністрацыя, пры наяўнасці сродкаў, аказвае разавую матэрыяльную дапамогу пры выхадзе на пенсію.

4.10. **Адміністрацыя гарантуе:**

4.10.1. Даваць магчымасць жанчынам, якія маюць 2-х дзяцей да 16 гадоў, па іх пісьмовай просьбе, штомесячна адзін вольны ад працы дзень без захавання заработнай платы. Канкрэтны дзень адпачынку вызначаецца па ўзаемнай згодзе.

4.10.2. Не звальняць адзінокіх маці, якія маюць дзяцей ва ўзросце да 14 гадоў (ці дзіця-інваліда да 16 гадоў) за выключэннем выпадку ліквідацыі структурных падраздзяленняў універсітэта.

4.10.3. На падставе арт. 207 КЗаП РБ стварыць з аднолькавага ліку прадстаўнікоў адміністрацыі і прафсаюза, тэрмінам на адзін



раўнацэнную работу (пасаду) абраным у прафсаюзныя органы работнікам пасля заканчэння іх выбарных паўнамоцтваў.

6.5. Захаваць дзейні-чаючы парадак платы прафсаюзных узносаў шляхам іх пераліку праз бухгалтэрыю універсітэта.

**Прафсаюзны камітэт мае абавязкі:**

6.6. Падтрымліваць прымаемыя меры адміністрацыі па ўмацаванню навукова-педагагічнай і вытворчай дысцыпліны, забеспячэнне парадку і арганізацыі вучэбнага працэсу, захаванасці ўласнасці і выхавання ў членаў працоўнага калектыву добрасумленных адносінаў да працы.

6.7. Здзяйсняць пастаянны кантроль за ходам выканання калектыўнага дагавору і перыядычна, не менш аднаго разу ў паўгоддзе, інфармаваць па гэтым пытанні працоўны калектыў.

6.8. Прафсаюзны камітэт прызнае, што забастоўка з'яўляецца крайнім сродкам вырашэння спрэчак і лічыць магчымым прымяняць яе толькі тады, калі ўсе іншыя законныя сродкі не дадуць вынікаў.

6.9. **Бакі прыйшлі да згоды:**

6.9.1.Даваць прафкаму інфармацыю, якая неабходна для вядзення калектыўных перамоў і рэалізацыі правоў прафсаюза па абароне працоўных і сацыяльна-эканамічных інтарэсаў супрацоўнікаў.

6.9.2.Прафсаюзныя актывісты - члены абраных прафсаюзных органаў - вызваляюцца ад асноўнай працы для ўдзелу ў рабоце прафсаюзных з'ездаў, канферэнцый, пленумаў і іншых статутных мерапрыемстваў з захаваннем сярэдняга заробку. Ім даецца свабодны час для выканання грамадскіх абавязкаў на карысць калектыву.

6.9.3.Вызваленыя прафсаюзныя работнікі з'яўляюцца роўнапраўнымі членамі працоўнага калектыву універсітэта і карыстаюцца ўсімі правамі і ільготамі аднолькава з імі.

## РАЗДЗЕЛ 7. ЗАХАВАННЕ ІНТАРЭСАЎ РАБОТНІКАЎ ПРЫ ПРАВЯДЗЕННІ ПРЫВАТЫЗАЦЫІ

7.1. Бакі прыйшлі да вываду:

7.1.1.Пры змяненні формаў уласнасці і гаспадарання, стварэнні (заснаванні) малых, сумесных, іншых прадпрыемстваў, фірм, кааператываў, дзе задзейнічаны асноўныя фонды і сродкі універсітэта, адміністрацыяй праводзяцца папярэднія перамовы з прафсаюзным камітэтам з мэтай дасягнення згоды ў пытаннях, якія закранаюць сацыяльна-эканамічныя інтарэсы калектыву.

7.1.2.Перадача, здача ў арэнду маёмасці, якая належыць універсітэту, дапускаецца з улікам меркаванняў прафсаюзнага камітэта.

7.1.3.Не дапускаць прыняцця неабгрунтаваных рашэнняў і прымусовай прыватызацыі.

Сапраўдны калектыўны дагавор прыняты на канферэнцыі працоўнага калектыву Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы 11 лістапада 1994 года са змяненнямі і дапаўненнямі, унесенымі канферэнцыяй працоўнага калектыву універсітэта ад 2 ліпеня 1996 года і са змяненнямі і дапаўненнямі на канферэнцыі працоўнага калектыву ад 4 красавіка 1997 года.

**Рэктар
Л.М.КІВАЧ.**

**Старшыня прафкама
У.А.ХІЛЮТА.**

---

***Паведамляе студэнцкі прафкам***

# ДАВАЙЦЕ БУДЗЕМ СЯБРАВАЦЬ

У красавіку праходзіла пашыранае пасяджэнне савета Еўрапейскай студэнцкай Асацыяцыі, на якім мне пашанцавала прадстаўляць наш універсітэт.

Пазнаёміўся з дэлегатамі Кіеўскага, Тбіліскага універсітэтаў, Белграда, МДУ. Кожная дэлегацыя магла расказаць аб сваім студэнцкім жыцці-быцці. Так, усіх нас запрашалі на фестываль “Студэнцкая вясна” у Туркменістан. Грузіны прапанавалі сустрэцца ў маі ў Тбілісі, дзе яны ствараюць Закаўказскі студэнцкі дом. А ў верасні на базе БДУ адбудзецца навуковая канферэнцыя “Моладзь і навука”. У рамках Еўрапейскай студэнцкай Асацыяцыі праводзіцца шмат мерапрыемстваў, цікавых і карысных. А інфармацыю аб іх рыхтуемся атрымліваць па лакальнай сетцы INTERNET.

На гэтым пасяджэнні савета адбылася сустрэча рэктара МДУ В.А. Садаўнічага з гасцямі. Ён выказаў пажаданне, каб, нягледзячы на перашкоды і сітуацыі ў краінах СНД, студэнты сябравалі, сустракаліся, абменьваліся думкамі. Асаблівую ўдзячнасць рэктар МДУ выказаў беларусам, бо ў нас - даўняя дружба, цёплыя ўзаемаадносіны, якія нельга парушыць.

Наступнае пасяджэнне савета Асацыяцыі плануецца ў чэрвені, і ўдзельнічаць у ім будуць не толькі студэнты, але і рэктары вышэйшых навучальных устаноў - членаў Еўразійскай студэнцкай Асацыяцыі.

**І. КЕРГЕТ,
студэнт 4 курса матфака,
намеснік старшыні
прафкама студэнтаў.**

# СЕМІНАР-НАРАДА Ў ГОМЕЛІ

Чарговы семінар-нарада старшынь студэнцкіх прафкамаў адбыўся ў Гомелі. На гэты раз галоўнай тэмай была арганізацыя вольнага часу моладзі. На базе вышэйшых навучальных устаноў Гомельскай вобласці адбыўся абмен вопытам па арганізацыі адпачынку, спартыўных, культурных мерапрыемстваў.

Была прадстаўлена шырокая культурная праграма, асабліва ўдалым было выступленне народнага мастацкага калектыву “Радзімічы”. Затым удзельнікі семінара пабывалі ў Мазырскім педынстытуце - паглядзелі канцэрт, пазнаёміліся з інтэрнатамі, прафілакторыем, які займае першы паверх аднаго з студэнцкіх інтэрнатаў.

**А. ГРЫНЬ,
старшыня прафкама студэнтаў.**

***В издательском отделе***

# ЛУЧШЕ, ЧЕМ ВЧЕРА

Любопытные цифры и факты приведены в информации о работе издательского отдела ГрГУ в первом квартале. Объем выпуска учебной и методической литературы составил почти 100 млн. рублей и значительно превысил показатели прошлых лет. Часть книг и брошюр поступила в библиотеку. Реализовано печатной продукции на сумму, достигающую 40 млн. рублей. Примечательно, что заказчиками учебной литературы все чаще становятся вузы и районные отделы образования не только области, но и республики.

# НОВЫЕ ИЗДАНИЯ

Увидела свет программа по курсу “Педагогика”. Она выпущена в издательском отделе ГрГУ под редакцией члена-корреспондента Белорусской академии образования, профессора В.П. Тарантея.

Авторами после долгих дискуссий сохранена традиционно сложившаяся структура курса: “Основы общей педагогики” - “Теория и практика обучения”- “Теория и практика воспитания”. Вместе с тем тематика и содержание курса существенно изменены.

Программа может быть использована не только в вузах, но и в педучилищах, в системе повышения квалификации учителей, а также в самообразовании.

Несомненный интерес представляет учебное пособие по курсу “Системы автоматизированного проектирования” для студентов специальности “Радиофизика”. Издана вторая часть учебного пособия-книги “Система P-CAD 4.50”. Авторы Бейтюк Ю.Р., Рамазанов В.М., Рамазанов А.М. обобщают опыт применения системы при схемотехническом и конструкторско-технологическом проектировании РЭА.

Изданы также методические рекомендации по спецкурсу “Школьный химический эксперимент” для студентов специальности “Биология” (сост. Лакоба С.Е., Третьякова Е.М.). Предлагаемая работа содержит рекомендации по проведению эксперимента, варианты различных методик лабораторных и практических работ, советы по приготовлению реактивов или по замене труднодоступных. Рекомендуется студентам использовать на занятиях по спецкурсу и во время педпрактики.

# ІМЯННЫЯ СТЫПЕНДЫІ

На пасяджэнні Савета універсітэта разгледжана пытанне аб прадстаўленні да імянных стыпендый студэнтаў па выніках зімовай экзаменацыйнай сесіі.

Да імянных стыпендый прадстаўлены наступныя студэнты:

да стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь - студэнт 3 курса другой групы матэматычнага факультэта Станіслаў САБАЛЕЎСКІ.

да стыпендыі імя Янкі Купалы - студэнт 5 курса другой групы факультэта фізічнай культуры Сяргей КІСЕЛЬ.

да стыпендыі імя Кандрата Крапівы - студэнтка 3 курса першай групы факультэта педагогікі і псіхалогіі Эла ГРЫНКЕВІЧ.

## ТЫДЗЕНЬ НАВУКІ – 97

Стала добрай традыцыяй праводзіць ва універсітэце тыдні навукі, пад час якіх падводзяцца вынікі навукова-даследчай работы выкладчыкаў і студэнтаў, аналізуецца яе эфектыўнасць, укараненне вынікаў даследаванняў у вытворчасць і вучэбна-выхаваўчы працэс. Так сталася і на гэты раз. Навуковыя мерапрыемствы праводзіліся з 21 па 25 красавіка. Тыдзень навукі быў насычаны цікавай і карыснай інфармацыяй.

Адкрыццё вялікай праграмы адбылося на пленарным пасяджэнні "Тыдня навукі - 97". З цікавасцю слухалі навукоўцы і студэнты даклад прарэктара па навукова-даследчай рабоце С.А. Маскевіча "Стан і перспектывы развіцця навукова-даследчай работы студэнтаў ва універсітэце".

Шмат ёсць удалых спроб укаранення навуковых распрацовак у навучальны працэс, у вытворчасць, больш змястоўнымі і дасканалымі становяцца тэмы студэнцкіх дыпломных і курсавых работ, а таксама курсаў, спецкурсаў, семінараў, якія праводзяцца на факультэтах.

Затым на факультэтах прайшлі навуковыя, навукова-практычныя і тэарэтычныя канферэнцыі выкладчыкаў, аспірантаў і студэнтаў.

У канцы тыдня зноў адбылося пленарнае пасяджэнне, на якім былі падведзены вынікі. Закончыўся "Тыдзень навукі-97" творчым круглым сталом, дзе навукоўцы абмяняліся думкамі, ідэямі, меркаваннямі аб перспектывах навуковай дзейнасці.

На жаль, мы не можам сёння расказаць больш падрабязна аб гэтых мерапрыемствах, бо, калі праходзіў тыдзень навукі, гэты нумар газеты ўжо рыхтаваўся да друку. Але найбольш цікавыя і змястоўныя матэрыялы аб навуковай дзейнасці студэнтаў знайдуць адлюстраванне ў наступных нумарах газеты.



### БЕЛАРУСЬ-РОССИЯ

## ГРАНИ СОТРУДНИЧЕСТВА

**С. КОНДРАТЬЕВА, профессор, доктор психологических наук, заведующая кафедрой психологии**

Конечно, наши связи с Россией уже не те, что были до распада Советского Союза. И все-таки мы сохранили сотрудничество с самыми видными психологами Москвы, Санкт-Петербурга, Ростова-на-Дону. Многолетняя дружба связывает нас с академиком Российской Академии Образования (РАО) профессора факультета психологии МГУ и заведующим лаборатории Психологического института РАО А.А. Бодылевым.

Благодаря ему мы имеем сегодня литературу, необходимую для развития нашего научного направления - психическая регуляция коммуникативной деятельности. Именно он прислал нам новые учебные программы по специальности "Психология", составленные огромным коллективом ученых МГУ, Московского гуманитарного института, института психологии РАН и Психологического института РАО.

Эти программы отражают новейшие данные научной психологии, как российской, так и зарубежной. Дар этот неоценим. Достать эти программы было бы невозможно.

Благодаря А.А. Бодылеву, мы имеем возможность получать информацию о научных конференциях, публиковаться в российских журналах.

Научные связи кафедры с Россией крепнут и благодаря тому, что я являюсь действительным членом двух российских академий - Международной академии акмеологических наук, которую возглавляет известный психолог Н.Ф. Кузьменко, профессор Санкт-Петербургского университета, и Российской академии педагогических и социальных наук, которую возглавляет крупный ученый, доктор исторических наук, профессор В.А. Тишков. Участвую в крупных сессиях этих академий, публикуюсь в изданиях Академии педагогических и социологических наук.

Мы поддерживаем связи с факультетом психологии Санкт-Петербургского университета, а за последние годы укрепляем контакты с фирмой "Иматон", которая осуществляет научно-методическое обеспечение практической психологии в России: регулярно получаем "Психологическую газету", очень интересную: в ней публикуется все новейшее в психологической науке.

У нас имеются связи и с Академией государственной службы при президенте Российской Федерации (зав. кафедрой акмеологии доктор психологических наук профессор А.А. Деркач).

Эти связи мы намерены укреплять, вести совместные исследования в области анализа психологической помощи государственным служащим.

## ЗАГЛЯДЫВАЯ В ПРОШЛОЕ, ДУМАЙ О БУДУЩЕМ

**Г. ДАНИЛОВ, редактор издательского отдела**

Идея создания правового государства в российской политико-правовой мысли начала активно разрабатываться в конце XIX - начале XX века. В основу принимались отечественные и западные (в основном немецкие) представления о правовой государственности. Русские правоведы создали оригинальную, содержательную систему взглядов о господстве права.

Посильную помощь в ознакомлении с политико-правовой культурой России того времени окажет учебное пособие "Социально-политическая и правовая мысль России XIX - начала XX века". Как отмечается в "Введении", содержание этого пособия нацелено на освещение важнейших политических и правовых идей и течений этой культуры, характеристику ее ключевых фигур, духовно значимых для российского общественного мировоззрения категорий и понятий.

Пособие состоит из двух частей. Первая часть уже увидела свет в издательском отделе ГрГУ. В ней большое внимание уделено освещению и анализу политико-правовых идей, понятий и течений XIX века. Ценность в том, что это пособие - результат совместной творческой работы преподавателей Гродненского госуниверситета им.Янки Купалы и Московского госуниверситета им. М.В. Ломоносова.

Авторами первой части пособия являются доцент кафедры истории и теории государства и права нашего университета В.Н. Ватыль, преподаватель кафедры истории социально-политических учений МГУ Д.В. Ермашов и доцент кафедры истории социально-политических учений МГУ А.А. Ширинянц. Рецензенты - доктор философских наук, профессор, зав. кафедрой истории русской философии МГУ М.А. Маслин, доктор философских наук, профессор, зав. кафедрой политического процесса России МГУ В.И. Коваленко. Первую апробацию названный курс прошел на философском факультете Московского государственного университета.

Издательский отдел ГрГУ с удовлетворением выполнил заказ кафедры социально-политической истории филфака МГУ, отправив в ее адрес часть тиража нового учебного пособия.

Коллективный труд ученых двух стран поможет лучше понять политико-правовую мысль России конца прошлого - начала этого века и на современном этапе развития общества.

## ПЕРШАЯ РЭСПУБЛІКАНСКАЯ НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

### ТАК ПАТРАБУЕ ЖЫЦЦЁ

8-9 красавіка на базе універсітэта праходзіла І Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя па тэме "Тэхналогіі бесперапыннай педагагічнай адукацыі і творчага самаразвіцця настаўніка" з міжнародным удзелам.

Пад час адкрыцця работы канферэнцыі перад яе ўдзельнікамі з прывітальным словам выступіў рэктар ГрДзУ, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар Л.М. Ківач. Ён коратка расказаў аб універсітэце, аб рабоце па стварэнні навучальных устаноў новага тыпу: гімназій, ліцэяў, калледжаў, аб сістэме павышэння кваліфікацыі.

Канферэнцыю падрыхтаваў факультэт педагогікі і псіхалогіі пад непасрэдным кіраўніцтвам яго дэкана В.П. Таранцея, і ва ўступным слове напачатку работы канферэнцыі ён расказаў аб мэтах і задачах, аб перспектывах развіцця такіх канферэнцый - а плануецца праводзіць іх кожныя два гады.

- Наш універсітэт, - адзначыў В.П. Таранцей, - мае пэўны вопыт па бесперапыннай педагагічнай адукацыі. Работы на гэтую тэму, праграмы публікаваліся ў "Народнай асвеце", выдаваліся зборнікі. Сёння праходзіць прэзентацыя праграмы "Педагогіка".

Вельмі цікавымі былі выступленні загадчыка кафедры ўсеагульнай гісторыі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы, прафесара, доктара гістарычных навук А.М. Нечухрына, загадчыка кафедры псіхалогіі, акадэміка, прафесара, доктара псіхалагічных навук С.В. Кандрацьевай, прафесара кафедры інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі А.Д. Бурыкава і іншых навукоўцаў-педагогаў, якія падзяліліся вопытам і ведамі ў справе ўкаранення новых тэхналогій у адукацыі.

У другой палове дня пачалася работа секцый па асобных накірунках. У кожнай з сямі секцый адбыўся жывы абмен думкамі і вопытам у тым ці іншым напрамку педагагічнай работы.

Па меркаваннях удзельнікаў канферэнцыі, прайшла яна добра, сталася карыснай для ее ўдзельнікаў. Даклады ўсе былі канкрэтныя, па сутнасці справы, без лішніх слоў і доўгіх уводзін. Адным словам, справа карысная. Удзел у канферэнцыі прынялі прадстаўнікі больш як 40 навучальных устаноў.

Да канферэнцыі былі выдадзены праграма і зборнік лекцый "Технообраз-97". У перапынках літаратуру можна было набыць, што ўдзельнікі канферэнцыі і зрабілі. Нельга не адзначыць, што зборнік лекцый атрымаў добрыя водгукі і карыстаўся попытам у ўдзельнікаў канферэнцыі.



# ВІЗІТ СУСЕДЗЯЎ

З 7 красавіка універсітэт прымаў гасцей - дэлегацыю з суседняй Польшчы. З візітам да калег прыехалі прадстаўнікі Люблінскага універсітэта імя Марыі Складоўскай-Кюры і Беластоцкага філіяла Варшаўскага універсітэта.

Госці з Польшчы пазнаёміліся з нашым універсітэтам. Некаторыя з іх, дарэчы, ужо не першы раз тут. Асноўнай мэтай іх візіту было ўдакладненне праграмы сумеснай работы і плана на будучы навучальны год.

Польская дэлегацыя таксама прыняла ўдзел у адкрыцці І Рэспубліканскай канферэнцыі па тэме "Тэхналогіі бесперапыннай педагагічнай адукацыі і творчага самаразвіцця настаўніка", дзе прафесар Люблінскага універсітэта Войцэх Віткоўскі выступіў з інфармацыяй аб сваёй навучальнай установе. У Люблінскім універсітэце - дзесяць факультэтаў, такія ж, ці амаль такія, як і ў Гродзенскім. У многіх напрамках люблінцы працуюць сумесна з Гродзенскім універсітэтам імя Янкі Купалы: ёсць сумесныя праграмы, ёсць новыя задумкі, аб чым і дасягнута дамоўленасць пад час візіту.

**Наш кар.**

*Міжнародныя сувязі*

# ГРАНИЦЫ, КОТОРЫЕ СБЛИЖАЮТ

**В. ЛЯВШУК,**
**инженер сектора зарубежных связей и академического предпринимательства**

Общеизвестно, что в принципе, любые интересующие нас научные или другие материалы при большом желании можно получать, не посещая никаких конференций. Но тем не менее заинтересованные лица предпочитают собираться на конференции. И делают это прежде всего для того, чтобы в общении, по словам Сухомлинского, своими идеями "опылять других". В этом смысле прошедшая в начале апреля на базе университета конференция "Правовые аспекты международного сотрудничества: Беларусь, Литва, Польша, Россия" только подтвердила известное правило, что конференция - это, прежде всего, встречи, контакты и личное общение.

Однако, если юристы и экономисты четырех стран собрались в Гродно пообщаться, то наш университет, выступая в качестве принимающей стороны, преследовал цели престижного характера. Потому что принять, расселить, накормить, оперативно размножить материалы, обеспечить все условия для продуктивного обмена мнениями - это очень серьезный труд, направленный на создание имиджа энергичного и солидного европейского университета. А создание такого имиджа является одним из долгосрочных направлений университетской политики.

Финансовое обеспечение конференции осуществляли представители Центрально- и Восточно-Европейской правовой инициативы (CEELI) Американской Ассоциации Юристов (АВА). Они провели уже несколько подобных мероприятий в других странах. И их благодарность за четкую совместную работу - свидетельство того, что университет со своей задачей справился достойно. 120 человек, приехавших из разных стран, познакомились с последней информацией в области законодательства и регионального политики своих стран, а также обменялись новыми идеями в области приграничного сотрудничества.

Огромная заслуга в четкой работе конференции принадлежит студенческой группе поддержки, ядро которой составляли члены университетской организации AIESEC. Будущие менеджеры трудились на всех участках: от регистрации участников до организации питания в перерывах. И эта работа стала для них хорошей школой.

# ТРИ ЧУДЕСНЫХ ДНЯ

***Постфактум***

Вы были хоть раз на днях матфака? Уверены, что да, ведь не побывать на этом празднике университета просто невозможно.

Целых три дня, насыщенных до предела юмором, весельем, радостью запомнились не только студентам, но и преподавателям.

Игровая программа под названием "Кто во что горазд" между командами преподавателей и студентов прошла в лучших традициях развлекательных программ. Зал изнемогал от смеха, настолько интересно было наблюдать за преподавателями, мгновенно перевоплотившимися в озорных студентов. Правда, команду преподавателей пришлось силой вытягивать на сцену, отлавливая по одному. Но, несмотря на некоторые приключения, игра, включающая в себя несколько веселых конкурсов, среди которых актерский, получивший оценку зрительских симпатий (заключался в том, чтобы тебя без слов поняла команда), конкурс по надуванию шариков и многие другие не менее интересные конкурсы, получилось неплохо - с дружеским счетом: ничья.

Благодаря дням матфака и первокурсники наконец-то стали полноценными студентами. И если у второго курса, готовившего посвящение, способности и таланты оказались на высоте, то первокурсникам так и не хватило смелости, чтобы весело и уверенно выйти на сцену, так, как сделали это их старшие братья.

Порадовали зрителей своими песнями и молодые, и известные барды города на вечере авторской песни, который запомнился всем.

Что такое студенты математического факультета сегодня? Это не замкнутые люди, помешанные лишь на формулах, цифрах и теоремах. Это одновременно и озорные весельчаки, и остроумные эрудиты, и, если надо, поэты и актеры, певцы и режиссеры.

Но лишь часть наших умений нашла свое отражение в заключительной программе "Студенческий каламбур".

Как зрители того и ожидали, матфак-шоу - веселая, беззаботная, задорная, чуть озорная команда - рассмешила даже самого равнодушного и хмурого зрителя. Все это, конечно, надо было видеть! Слова здесь, к сожалению, могут оказаться бессильными.

К слову сказать, команда матфака, принимавшая участие в КВНе между факультетами университета, хоть и не получила гран-при, но заняла первое место.

Дни матфака - это всегда праздник нашего факультета, можно сказать, даже всего университета. Это всегда радостное событие, подкрепленное энергией студентов, добрыми отзывами преподавателей, светящимися радостными глазами зрителей, замечательным смехом и добрыми улыбками.

**К. СЕНАТОРСКАЯ,**
**студентка,**
**председатель оргкомитета дней матфака.**

# В ПОТОКЕ НОВОСТЕЙ

- Подведены итоги конкурса "Студент города", организованного отделом молодежи горисполкома. Дипломы и денежные премии получили и представители нашего университета: Александр Борисенок (4 курс физико-технического факультета), Наталья Енко (5 курс филологического факультета), Вадим Онисько, Павел Крышалович (4 курс физико-технического факультета).

Объявлены также итоги конкурса "Молодые таланты города". Среди победителей - студенты факультета физической культуры ГрГУ Александр Жилинский, Александр Сливинский.

- Сразу два "порочных" пристрастия студентов объявлены вне закона в Липецком пединституте: табакокурение и жевание резинки. Наиболее опасной в приказе ректора признана жвачка. Нескольким студентам-нарушителям уже объявлены выговоры. Санкция предусмотрена более строгая: отчисление. Сообщая об этом великом почине, "Комсомольская правда" призывает: не жуйте, студенты, гранит науки.

- 3 мая в Минске начнет свою работу I учредительный съезд новой молодежной общественной организации патриотической направленности. На общем городском собрании инициативных групп Белорусского патриотического союза молодежи избрано 20 делегатов съезда. На том же собрании были названы и такие цифры: в Гродно создано 78 инициативных групп, в которых зарегистрирован 531 человек.

- Две минимальные зарплаты составит стипендия Федерации профсоюзов Беларуси. Таких стипендий в республике всего шесть. Одну из них в течение шести месяцев будет получать третьекурсница факультета педагогики и психологии нашего университета Элла Гринкевич.

- Необычайное по дерзости преступление произошло в Минске. Похищена уникальная коллекция: 1903 редчайшие серебряные монеты арабского халифата, датированные концом I - началом II тысячелетия н.э. По оценке коллекционеров-нумизматов, эти сокровища, найденные на территории Беларуси, стоят не одну сотню тысяч долларов. Остается добавить, что преступление совершено в здании истфака БГУ, где размещен музей с уникальными экспонатами. Об этом сообщила московская газета "Континент".

*Рэдактар* **Людміла Мікалаеўна ДАНІЛАВА**

*Заснавальнік: Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы.*
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 519.

Газета набрана, звярстана і аддрукавана на тэхніцы выдавецкага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. 230023, г. Гродна, вул. Ажэшкі, 22.

*Набор і вёрстка:*
**М. ВЕРСТАК, П. КРЫШАЛОВІЧ**

*Здадзена ў набор 18.04.97*
*Падпісана да друку: 15.00*
*Заказ № 60*

Аб'ём - 1 ум. друк. арк.
Наклад 500 асобнікаў.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

*Наш адрас:* ✉ *230023, г.Гродна, вул. Ажэшкі, 22, п.228.* ☎ *72-08-17.*